Пралетары ўсіх краёў, злучайцесся

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№.....

№ 17

ВЕРАСЕНЬ

1929 г.

Работніцы шчотачнай ф-кі падпісваюцца на пазыку індустрыялізацыі.

Імені ЛЕНІНА

Чырвоны абоз у Менску.

Здадзім хлеб дзяржаве—дапаможам выканаць пяцігадовы плян будаўніцтва сацыялізму.

Выкрыем кулацкія махінацыі — спробы іх закапаць хлеб, гнаіць яго ў зямле. Усе лішкі новага ўраджаю—дзяржаве. Ніводнага фунта хлеба прыватніку. Рашучая барацьба з гандляром-скупшчыкам хлеба. Арганізуем чырвоныя абозы, каляктыўна здадзім хлеб каапэрацыі—гэта дапаможа выканаць батрацтва, беднота і сераднякі, згуртаваўшыся яшчэ шчыльней вакол камуністычнай партыі. Працоўныя сяляне шэрагу сельсаветаў Менскай акругі зрабілі добры пачын. У дзень каляктывізацыі сяляне Н. Дароскага, Старасельскага, Рагоўскага і іншых сельсаветаў здалі лішкі хлеба новага ўраджаю сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

На 130 падводах беднякі, сераднякі вёсак і сябры арцелі імя Чарвякова прывезьлі ў Менск звыш 2.300 пудоў хлеба. У Нова-Дароскім сельсавеце за 5 гадзін было сабрана звыш 500 пудоў хлеба. Сялянка-бяднячка Рагоўскага сельсавету за ноч намалаціла 5 пудоў жыта, каб пасьпець здаць хлеб чырвонаму абозу. Селянін-серадняк Сянюкевіч здаў звыш 160 пудоў.

Гэты прыклад пераймуць працоўныя сяляне ўсёй Беларусі.

Батрачка, калгасьніца, бяднячка і сераднячка!

Будзь на чале арганізацыі чырвоных хлебных абозаў.

РАБКОРКІ! Пішыце аб удзеле работніц у сацыялістычным спаборніцтве, аб выніках работ ударных брыгад, арганізаваных на прадпрыемстве, што перашкаджае пасьпяховаму выкананьню ўмоў спаборніцтва.

СЯЛЬКОРКІ! Пішыце аб удзеле грамадчыц, дэлегатак і актывістак у арганізацыі чырвоных хлебных абозаў.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, вул. К. Маркса, № 14.
Тэлефон № 243.

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТ. ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 1 месяц	. . .	15 кап.
„ 3 „	. . .	45 „
„ 6 „	. . .	90 „
На год	. . .	1 р. 80 „

№ 17 (66) || Верасень 1929 г. || № 17 (66)

Решительная борьба с правым уклоном.

„Кто устал, кого пугают трудности, кто теряется— пусть даст дорогу тем, кто сохранил мужество и твердость. Мы не из тех, кого пугают трудности. На то и большевики мы, на то и получили мы ленинскую закалку, чтобы не избегать, а итти навстречу трудностям и преодолевать их".

Сталин.

Правый уклон об'явлен партией главной опасностью в настоящий период нашего социалистического строительства.

Сейчас наша страна с большим напряжением проводит в жизнь пятилетний план народного хозяйства.

Нам нужно переделать нашу промышленность так, чтобы не быть в зависимости от иностранных капиталистов, и строить на своих фабриках и заводах все машины, которые нам нужны как для промышленности, так и для сельского хозяйства.

Нам нужно перестроить сельское хозяйство так, чтобы организовать бедняцко-середняцкие массы в крупные колхозы, нам нужно строить большие зерновые и животноводческие фабрики—совхозы.

Таким образом, партия видит выход в изживании хозяйственных трудностей в быстром темпе индустриализации страны и реконструкции (переустройстве) сельского хозяйства.

В этой великой стройке рабочий класс под руководством партии проводит решительное наступление на кулацко-нэпманские элементы города и деревни, которые нам оказывают бешеное сопротивление.

Наши трудности еще усложняются тем, что нам приходится строить в капиталистическом окружении, при огромнейшем сопротивлении международной буржуазии.

Партия эти трудности предвидела. XVI Всесоюзная партконференция указала правильный путь борьбы с этими трудностями. Мы должны строить решительно и быстро наше соц. хозяйство по 5-тилетке принятой XVI партконференций. Мы должны свергнуть с нашего пути все рогатки наших классовых врагов.

Но у нас в партии оказались и такие, которые испугались трудностей. Они выступают против быстрого темпа индустриализации, против усиленного наступления на нэпмана и кулака. Они говорят: пока надо итти потихонечку, подсократив стройку фабрик и заводов, подсократив развитие совхозов и колхозов. Способствовать развитию более крепкого индивидуального хозяйства, т.-е. кулаку.

Это значит вести страну не к социализму, а назад, к капитализму. Это значит дать расти нашему классовому врагу. Вполне ясно, что эти товарищи находятся под влиянием мелкой буржуазии, они защищают их интересы. Партия с такими борется и будет бороться. Пролетариат, опираясь на бедноту в союзе с середняком, под руководством коммунистической партии,—проводит в жизнь пятилетний план народного хозяйства.

Мы сейчас имеем обострение классовой борьбы как в городе, так и в деревне. Это нас заставляет быть еще более бдительными, а правые уклонисты хотят усыпить бдительность пролетариата, не желая ссориться с кулаком и нэпманом, а это значит работать в их интересах, это значит работать против пролетариата, против пролетарского государства.

Вот факты к чему сводится правый уклон в жизни на практической работе.

— Не нужно ссориться с кулаком. Мы должны дать ему возможность развивать свое хозяйство и предоставить ему льготы по сельско-хозяйственному налогу,—говорил член совхозской ячейки—Чечура (Холопеничский р-н).

Лошницкое сельско-хозяйственное товарищество все время давало кредиты на большие суммы кулацким элементам, а отказывало в кредите бедноте.

Росицкое кредитное товарищество использовало фонд бедноты для кредитования зажиточных, тоже в Плещеницах и других местах.

А где были руководители-коммунисты? Почему они так делали? Потому, **что они правые уклонисты,** потому, что они не проводят пролетарскую классовую линию; они не хотят **ссориться** с кулаком, т.-е. фактически ему помогают.

Правые уклонисты в Наркомземе Белоруссии не проводили в жизнь решения партии о коллективизации деревни, а проводили землеустройство хутор-

ское, т.-е. такое, которое дает возможность развиваться кулаку.

Кустпромсоюз Белоруссии не захотел „ссориться" с крепкими хозяйчиками-нэпманами, а поэтому в артелях кустпромкооперации трудно было попасть кустарю-бедняку; артели были засорены враждебными нам нэпманскими элементами.

Вот какими путями правые уклонисты и те, которые к ним примиренчески относятся, хотят задержать ход индустриализации нашей страны.

Разоблачая истинное лицо правых уклонистов, и примиренцев, пролетариат и трудящееся крестьянство, под руководством партии преодолеют эти трудности, будут упорно и настойчиво бороться против правых уклонистов.

„Беспощадно выкрывая мелко-буржуазную, капитулянскую идеологию правых, мы должны, развернувши творческую самокритику масс (врагами каковой на деле выступают правые), организовать широкие партийные и беспартийные массы, для такой же решительной и беспощадной борьбы против правого уклона на практике".

(Из статьи секретаря ЦК КПБ т. Гамарника).

Работницы и трудящиеся крестьянки должны мобилизовать свои силы, чтобы под руководством партии, совместно со всем пролетариатом, выкрывать проявление правого уклона в работе тех организаций, куда затесались правые уклонисты, беспощадно разоблачая их.

Р.

Грошы на індустрыялізацыю дадзім.

Дапаможам краіне Саветаў будаваць фабрыкі, заводы, электрастанцыі, перабудоўваць сельскую гаспадарку. Ніводнай работніцы, батрачкі і працоўнай сялянкі—бяз 3-й пазыкі індустрыялізацыі. Працоўныя жанчыны актыўна дапамагаюць распаўсюджванню 3-й пазыкі. Доўгае трыманьне пазыкі—вось наш абавязак перад краінай Саветаў. Здадзім аблігацыі на каляктыўнае захаваньне.

Каб расьлі новыя, буйныя фабрыкі, каб выраблялася больш сельска-гаспадарчых машын, дапаможам індустрыялізацыі краіны Саветаў—парашылі жанчыны саўгасу Насавічы (Гомельская акр.). 7 жанчын падпісалася на 305 руб. 3-й пазыкі індустрыялізацыі. Даярка-Музычкіна зарабляе ўсяго 32 рублі ў месяц, а дзяржавае пазычыла цэлых 75 рублёў.

А лельчыцкія дэлегаткі (Мазыршчына) каляктыўна купілі 25-рублёвую аблігацыю, і 2 дэлегаткі падпісаліся на 10 рублёў кожная. Лельчыцкія дэлегаткі выклікалі на спаборніцтва па распаўсюджваньню пазыкі Мілашэвіцкі і Семяніцкі дэлегацкі сход.

Дамо грошы дзяржаве, узмацнім абароназдольнасьць СССР—сказала нарада грамадчыц Круглянскага раёну (Аршанская акруга). І тут-жа удзельніцы нарады падпісаліся на 260 рублеў пазыкі. І ня толькі гэта. Грамадчыцы ўзялі на сябе абавязак распаўсюдзіць кожнай ня менш, як на 25 рублёў пазыкі.

Нашай дапамогай дзяржаве адкажам на выпад кітайскіх бандытаў—заявілі жанчыны з Мазырскага ЖАКТ. На 550 руб. узялі яны

пазыкі і выклікаюць на спаборніцтва ў гэтай справе ўсе ЖАКТ'ы Беларусі.

А жонкі рабочых пасёлку „Комінтэрн" (Менск) ня толькі самі падпісваюцца на 3-ю пазыку, але і дапамагаюць у распаўсюджваньні яе. Ужо сабрана падпіска на 1050 руб.

Вёска Лошыца падпісалася на 555 руб. на пазыку. А 10 жанчын гэтай вёскі тут-жа на сходзе пазычылі дзяржаве 150 рублёў.

(Скарыстаны допісы карэспандэнтак: Паляковай, Роявай, Якуш, Хаміцкай, Пясьняк, С. Л. і Жыгалка).

Подпишемся все на 3-й заём.

Подписка на 3-й заем индустриализации у нас проходит хорошо. Подписываемся сами и вызываем других работниц.

Я получаю 45 рублей в месяц вызвали меня на 50 руб., а я подписалася на 100 р. Тоже сделали Шелева и Рохкинд.

Я призываю всех работниц подписаться на 3-й заем индустриализации и не закладывать облигации, а сдавать на коллективное хранение.

Аня Айщина.

Работница тряпичного отделения ф-ки „Спартак":

СЯЛЬКОРКІ. Пішыце аб сацыялістычным спаборніцтве на вёсцы. Як праходзіць падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Як вясковыя актывісткі дапамагаюць змагацца з прыватным гандляром—скупшчыкам хлеба.

ПЛАН ВЕЛИКИХ РАБОТ.

В резолюции XVI Всесоюзной партийной конференции пятилетний план социалистической стройки Советского Союза назван вполне правильно „программой развернутого социалистического наступления".

Для того, чтобы понять всю исключительную важность пятилетнего плана, достаточно будет напомнить, что всего только 3—4 года тому назад мы не имели даже ежегодных контрольных цифр, то-есть не было твердого плана даже на 1 год. А теперь рабочий класс, с участием всех трудящихся масс, под руководством партии наметил строго расчитанный, продуманный план социалистического строительства во всех областях народного хозяйства.

В капиталистическом обществе, где есть частная собственность на орудия производства, где фабрики и заводы принадлежат капиталистам, ведущим между собою бешеную конкуренцию в погоне за прибылью конечно о плановом хозяйстве не может быть и речи.

Пятилетний план исходит из генеральной линии партии на индустриализацию страны, на социалистическую переделку деревни, коллективизацию сельского хозяйства, на энергичное вытеснение кулака и нэпмана. Основной упор в пятилетнем плане взят на производство орудий труда; это значит, что мы сами должны строить машины, тракторы и прочие орудия труда с тем, чтобы не ввозить их из-за границы и не быть зависимыми в этом отношении от капиталистических стран.

Нам нужно бысто развивать производство металла, угля, железа, химическую промышленность для того, чтобы быстрым темпом строить новые фабрики, заводы, двинуть тысячи машин сельско-хозяйственных в деревню, для колхозов и совхозов для того, чтобы укреплять обороноспособность нашей страны, на случай войны. Нам нужно, как сказал XV партс'езд догнать и перегнать в техническом отношении передовые капиталистические страны.

Пятилетним планом намечен годовой рост продукции фабрик и заводов в среднем на 20%, в то время, как капиталистические страны, в самые бурные годы своего развития, росли ежегодно только на 7—10 процентов.

По пятилетнему плану намечено вложить в народное хозяйство Советского Союза 64 миллиарда рублей, в то время как за прошлое пятилетие было затрачено только 25 миллиардов.

Общее количество наемного труда в стране увеличится свыше чем на 4 миллиона, по сравнению с 27-28 годом. Одних только рабочих, занятых на предприятии, где насчитывается не меньше 50 рабочих, увеличится почти на миллион. По производству чугуна, который является одним из самых ярких показателей развития промышленности, мы к концу пятилетия передвинемся в ряду других стран, с 6-го на 3-е место и будем позади только Америки и Германии. По добыче каменного угля, мы с 5-го места передвинемся на 4-е и впереди нас будут только Америка, Англия и Германия.

По пятилетнему плану намечено провести коренную переделку нашего распыленного, отсталого сельского хозяйства. Раскиданные, селянские полоски будут организованы в мощные коллективы; будут построены крупные зерновые фабрики-совхозы.

По пятилетнему плану в колхозах будет организовано 20 миллионов крестьян и 1 миллион сельско-хозяйственных рабочих будет занято в совхозах. Урожайность у нас еще слишком низка. По пятилетке намечено повысить урожайность не меньше, чем на 35%.

При быстром темпе коллективизации деревни, одновременно будет оказываться всемерная поддержка бедняцким и середняцким хозяйствам через кредит, вовлечение в разные виды производственного кооперирования и пр.

Все эти мероприятия дадут возможность еще теснее организовать бедняцко-середняцкую массу для борьбы с кулаком, для окончательной его выкорчевки.

Осуществление пятилетнего плана требует от партии и всего рабочего класса, от каждого батрака, бедняка и середняка, огромного напряжения и внимания. Наша страна является еще очень отсталой в технико-экономическом отношении. Мы окружены капиталистическими странами, которые никак не могут мириться с нашим ростом и готовят войну против нас, партия знает об этих трудностях, но не боится их.

В нашей партии есть нытики, боящиеся трудностей, не верящие в осуществление пятилетнего плана социалистической стройки. Они против проводимого партией быстрого темпа индустриализации, они против коллективизации сельского хозяйства.

Жизнь беспощадно **опровергла все** пророчества этих нытиков. Первый год пятилетки мы уже провели. Этот год показал, что намеченное по пятилетнему плану, мы можем провести даже в более короткий срок. Мы далеко перешагнули намеченные цифры по росту продукции фабрик и заводов, по росту колхозов.

Социалистическое соревнование, огромный энтузиазм, охвативший рабочие массы и трудящееся крестьянство в социалистической стройке, является верным залогом того, что трудности будут преодолены. Нужно, чтобы исключительная важность пятилетнего плана была понята каждой работницей, батрачкой, бедняцко-середняцкой массой. Нужно провести борьбу с прогулами, расхлябанностью, неуклонно поднимать производительность труда, еще больше развернуть социалистическое соревнование в городе и деревне.

Нет сомнения, что железная воля рабочего класса Советского Союза, под руководством коммунистической партии приведет к осуществлению пятилетнего плана, и мы догоним и перегоним в технико-экономическом отношении передовые капиталистические страны; этого требуют от нас интересы мировой революции.

Кабаков.

Блонь

Савгаская дзесяціна дала 125 пудоў жыта. Работніц Блоні ня відаць ў грамадзкай працы, яны не актыўны ў гаспадарчым разьвіцьці саўгасу, сярод іх ёсьць няпісьменныя.

Партыйная ячэйка і рабачком нічога не рабілі для таго, каб павысіць культурна-палітычны ўзровень работніц, прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў нашым будаўніцтве.

Саўгасьніцы, за ашчадныя адносіны да машыны, павышэньне працдысцыпліны, у першыя шэрагі змагароў за павышаны ўраджай.

Глохне дзятлаў стук.

Зялёныя берагі амывае рэчка Блонь. Мейсцамі выбіла яна сабе круглыя, глыбокія каўцёбы, з якіх прарываецца і зьвілістай срэбнай стужкай бяжыць далёка, хаваецца ў кустох вярбняку і алешніку.

На адным беразе раскінуўся савгас, на другім—за мастком—прытулілася вёска Блонь.

Патануў у зелені савгас. Дзені-дзе выглядаюць раскіданыя будынкі, сярод іх бялее новы дом для рабочых і нядаўна пабудаваны клюб.

Да сялібы прымыкае 13-гектарны сад, у якім так спрытна пастрэльваюць жоўценькія і чырванашчокія яблыкі. Пад садам на ўзгорку высокая старая асіна, з сухім стромчата-зломаным верхам. Стырчаць іглістыя сухія трэскі высока ўгары.

Тут, тук, тук—стукае нехта. Гэта дзяцел дзяўбе кару старое асіны. Дзяцел пакінуў нязьменнай сваю тэхніку. Тук, тук, тук—нейкі сум наводзіць раўнамернае майстраваньне вастрадзюбай птушкі. Чымся старым палыхне, мінулым, такім нездарэчным, нязграбным у параўнаньні з бурліва-кіпучым жыцьцём, перабудовай на новы лад гаспадаркі Блонь.

Але вось нехта голас падаў.

— Э-гэ-гэ!

Задымілася вуліца пылам, а пасьля заквітнела чырвонымі, адна ў адну, нямецкай пароды каровамі. Гэта нядаўна заведзенае саўгасткае стада. А ззаду кульгае старэнькі пастух.

Усьміхаецца дзядуля, нават песьню пачаў мырмыкаць старэчымі вуснамі. Гэта-ж ня козы якія-небудзь задрыпаныя, а 66 кароў, і зараз дзядуля над імі галоўны начальнік. Трыцца каровы адна аб адну, ім вуліца вузкая нават.

Ну і стада, адно заглядзеньне!

Далей, далей у поле! Там залацяцца стрыжаныя пожні. Пажалі ўсё жыта ў савгасе і ўжо змалацілі нават. Вось тут і даведаліся саўгасьнікі: дзесяціна зямлі дала 125 пудоў жыта. А побач сялянскае поле добра калі дасьць 50—60 пудоў, а бывае і 35 пудоў зьбірае селянін з дзесяціны.

Ня вераць сяляне вачом сваім, гледзячы на саўгаскае жыта.

— Гэта-ж трэба, як лес парасло. А каласы якія! Ядраное жыта.

— Чым вы дагаджалі яму?

А савгас ужывае 4 сарты угнаеньня: мінэральнае, зялёнае, торф і гной. У дадатак—правільная і сваечасовая апрацоўка глебы.

Вось што так шчодра заплаціла за працу савгаскіх рабочых.

Некалькі лічбаў.

Савгас Блонь мае пахаці 260 гектараў, 100—сенажаці, сад і пітомнік 5 га. З жывёлы: акрамя кароў—41 маладняку, 26—рабочых і 12 маладых коняй; з прадпрыемстваў—сыраварны і крухмальны завод ды млын.

Нясупынна круцяцца віньцікі гэтай камбінаванай гаспадаркі. Кожны год новыя прыбыткі. Мацнее Блонь. Абарот за апошнія 1½ гады—адзін мільён восемсот тысяч. І за гэты-ж тэрмін прыбытак 60 тысяч.

У савгасе заведзены правільны 8-палёвы севазварот, а з гэтага году ўводзяць дзевяціпольле.

Ужо 5 год як па блоньскіх палёх трактар гуляе. Набыў яго савгас, пусьцілі на поле. Дзівіліся сяляне, гледзячы на сталёвага каня. А трактар капануў нетры, дагэтуль нікім не закранутыя, на верхнюю скарынку угноенай глебы вывярнуў рудыя пласты.

Ня звыкла поле да такіх парушэньняў стагодніх, дзедаўскіх звычаяў, закапрысіла і першы год заскакаў ўраджай.

Але ўпарта, упэўнена націскала рука на шырокае савгаскае поле. Стараннай апрацоўкаю і розных відаў ўгнаеньнямі глушылі капрысы глебы. Год за годам узрастаў ураджай. А сёлета...

Савгас Блонь мае права ганарыцца сваімі посьпехамі.

Зьнікла заняпаласьць. Буйнее гаспадарка і неразрыўна з гэтым зьніжаецца сабекошт збажыны. Год назад жыта сабе каштавала 8 р. 73 кап. цэнтнэр, а праз год толькі 7 р. 48 капеяк, авёс з 8 р. 25 к. саскочыў на 3 р. 48 к., тое-ж з ячменем, бульбай і іншым.

Цесна злучаная праца з аграномічнымі ведамі куе моцную савецкую гаспадарку, дабівае рэшткі колішняга жабрацтва.

А калі заблішчэла маланка.

Дзень адпачынку. Сонца з-пад хмары прыпякала, таму рэчка гучэла галасамі: рабочыя купаліся, а малыя боўталіся каля берагу.

На травіцы, пад дрэвамі адпачывалі дзяўчаты, а на ганку гутарка ішла аб яслях дзіцячых, якія, на жаль, у савгасе працуюць вельмі кепска. Старая бабулька, з вогнутай сківіцай абмахнула пажоўклаю хустачкаю сьлязьлівыя старэчыя вочы і прагаварыла.

— Я вось была дзяціная матка, а зараз стала ўнучая бабка. Вы мяне старое паслухайце, ей-жа богу, гуртавое—чартавое—вось што.

— І зусім ня так,—перабіла маладая жанчына. Але, убачыўшы, што пераконваць старую ня варта, яна адышла ўбок і пачала апавядаць.

— Вось як у савгасе было. Шостае жніўня—дзень індустрыялізацыі. Усе рабочыя малаціліна карысьць індустрыялізацыі ў гэты дзень, толькі двое ня вышлі на работу і тыя неўзабаве прышлі ў рабачком, напрасіліся, каб ім замест гэтага ў любую нядзелю працу далі. Добра працавалі, як сабе. А на другі дзень ячмень у полі пасох як арэх. А сонца парыць як сёньні, вядома на дождж.

Час кідаць работу. Патаміліся усе. І ведаем, што: намокне ячмень—папсуецца. Што тут рабіць.

А тут кіраўнік савгасу.

— Ну, як будзем—пытаюць рабочыя.

— Што-ж дождж будзе як піць даць. Глядзеў на баромэтр (машынка такая, якая праракае надворра).

Зноў за снапы, дружна хэўрай. Да 9 гадзін вечару ніводзін з поля ня зышоў. А як толькі апошнія снапы былі складзены ў гумне, заблішчэла маланка, сінім водблескам поле заліла, гром загрымеў, брызнуў дождж.

Усю ноч ліў доўждж як з вядра. Натаміўшыся рабочыя адпачывалі спакойна. Ячмень з 10 савгаскіх гектараў ня мок, а такі-ж сухенькі ляжаў у гумне.

Вось вам і гуртавое. А ня было б гурту, хіба-б справіліся? Такі загінула-б збажына, прыбіла-б даждж.

Патаміліся, але сваё адстаялі.

У сям'і не бяз выродка.

Так і ў Блоні, ёсьць і выродкі ў савгаскай сям'і.

Савгас паступова пераходзіць на зьдзельшчыну. Гэта мае ня кепскія выні кі. Работніцы крухмальнага заводу так налягалі на працу, што за апошні год завод даў 120 тысяч пудоў крухмалу. Рабочым заробак прыбавілі.

Але ёсьць у Блоні адзінкі, якія клапацяцца не аб гаспадарцы, а выключна аб уласнай кішэні. Нават комсамольцы некаторыя кажуць: „Толькі зьдзельна плаці, бо хіба-б я падзенна рабіў так!"

А быў яшчэ больш паказальны выпадак.

Прышла пара дрэвы абрэзваць. Па думцы спецыяліста і некаторых рабочых вызначылі норму—400 дрэў на чалавека.

Гвалт паднялі тыя, хто дбае толькі ў кішэню.

— Ды хіба гэта магчыма—400 дрэў. Зроду больш 250 ня вырабім.

Зьнізілі норму. А калі пачалі працаваць, то некаторыя выгналі па 400-450 дрэў.

Вось па такіх абдзіралах павінна стукнуць грамадзкасьць, і ўсе рабочыя, якія зацікаўлены ў росьце савецкай гаспадаркі.

Ядраное жыта.

Іван Сямёнавіч.

— О, гэта гаспадар,—кажуць рабочыя, аб кіраўніку савгасу Блонь. У яго нідзе зерня не загіне дарэмна, у глум ня пойдзе. Паляруецца хто, ня змажа машыну, дык здаецца, што іржа раз'ядае нутро Івана Сямёнавіча.

— Патрабавальны ён, але выконваюць ўсе, бо бачаць, што дбае не сабе, а ў гаспадарку,—кажуць рабочыя.

Земляком яго клічуць між сабой саўгасьнікі, бо тутэйшы ён: маці—сялянка, на загончыку зямлі і зараз калупаецца, а бацька калісьці чыгуначнікам быў.

Многа бачыў на сваім вяку Іван Сямёнавіч. Пасьля даручылі яму кіраваць гаспадаркай Блонь. Гаспадарка складаная, трэба сілы прыкласьці. Але ўзяў на сябе гэты экзамен. І зараз за працу ня ганьбяць.

Малады, здаецца блазьнюк па выгляду, а кожнае слова прадуманае, пэўнае, рашучае.

— Стаміўся, цяжка кіраваць, але шкода кідаць, разьвітацца з гаспадаркай; разам з ёю ішлі мы, расьлі, практыкаваліся.

Жняярка ў калгасе.

Што год, то крок наперад. Трактар набылі, стада, а хутка сьвіназавод пабудуем, мэханізуем сыраварны. Электрычнасьць - бы прыцягнуць нам на службу, вось што рушыла-б усё. Я ужо думаў над гэтым.

Гаворыць, а твар усьмешкаю сьвеціцца. Відаць, што кожным нэрвам адчувае пульс гаспадаркі.

А ў сялян аб кіраўніку такія водгукі:

— Ніякай кепскай заўвагі за ім ня было ўвесь час, нават гарэлкі ня п'е.

А работніц ня відаць.

На здабытым Блонь ня спынаецца, нішчыць перашкоды на шляху новых перамог.

— Яшчэ большага ўраджаю чакаць будзем, вунь колькі попелу па полі расьсеялі!

Узімку веды выкоўвалі —для рабочых сельска-гаспадарчыя курсы правялі. Зараз мяркуюць арганізаваць курсы для вывучэньня сельска-гаспадарчых машын.

А вось работніц амаль не адчуваецца ў жыцьці савгаскім. З 12 работніц—4 няпісьменныя. У партыі сталых работніц савгасу—ніводнай. На вытворчых нарадах калі і скмеціш жанчыну, дык толькі адзінку. Адна работніца абрана кандыдатам у сябры рабочкому, але аб ёй нават забыліся рабочыя, бо ніякай працы па рабочкому ня выконвае, нічым не адрозьніваецца ад сваіх таварышак. На сходах агульных і то ня відаць работніц, каб выказалася, унесла прапанову.

Сорам Блоньскім работніцам. Нікуды ня варта такая замкнёнасьць, адарванасьць ад грамадзкай працы.

А партыйная ячэйка і рабочком моўчкі глядзелі на гэта, „нічога не рабілі для таго, каб прыцягнуць работніц на вытворчыя нарады, павысіць палітычны ўзровень, зацікавіць справай уздыму гаспадаркі.

Дырэктыва партыі аб узмацненьні работы сярод савгасьніц, як часткі вясковага пролетарыяту ня выконваюцца арганізацыямі, якія кіруюць працай у Блоні.

За павышэньне актыўнасьці савгасьніц трэба ўзяцца рашуча.

Скарб для вёскі.

Для вясковай беднаты савгас—гэта скарб. За мінулы год аднаго насеньня абмянялі сялянам 44 тон. Даюць машыны на пракат, сеялкі плугі і іншыя. Бядняцкіх плугоў і барон адрамантавалі ў гэтым годзе 25 штук, коньмі савгасу апрацавалі ў гэтым годзе 3 гектары бядняцкой зямлі, насеньня перачышчана сялянам 128 тысяч пудоў, злучны пункт абслугоўвае сялянскую жывёлу.

І ўсе-ж такі...

— Я да вас, па гуркі, прадаеце, кажуць людзі.

— Ды што ты, Гануліка, сама-ж дапамагала садзіць іх у савгасе, а сваіх не нагадавала.

— Не растуць у мяне ў гародзе, хоць ты плач, не растуць ды і годзі.

Многа адсталі яшчэ вёскі ў параўнаньні з акаляючымі савгасамі і калгасамі. Таму пагаварваюць сяляне акаляючых вёсак.

— Ня інакш як у каляктыў трэба аб'яднацца.

Асабліва, калі бачаць як на полі саўгаскім бяжыць „сталёвая жанчына", якая сама жне і снапы вяжа—жняярка і снапавязалка.

Правільна. У каляктыў аб'яднацца.

Бабка з праваленай—сківіцай, якая шамкала „гуртовае-чартавое", ўжо аджыла свой век, адпакутвала. А мы пакутваць ня будзем. Батрацтва, вясковая беднота і серадняцтва, аб'яднаўшыся ў калгасы, праз межы, якія плямамі брыдкімі поле паскудзяць, мы пусьцім сталёвага каня. Пасьля па аб'яднаных загонах, па залатой збажыне прабяжыць „жанчына", якая сама жне і вяжа снапы.

В. Хмялеўская

Савгас Блонь, Пухавіцкага раену.

Увага дашкольнаму паходу.

У вялізарнай справе па сацыялістычнай перабудове народнае гаспадаркі з вялікім імпэтам удзельнічаюць працоўныя жанчыны. Але, каб уцягнуць усё новыя і новыя колы работніц, батрачак, савгасьніц, калгасьніц і працоўных сялянак у гэтую справу, яшчэ больш разгарнуць іх удзел у сацыялістычным спаборніцтве, трэба палепшыць бытавыя ўмовы працоўнай жанчыны.

Пастановай прэзыдыуму ЦСПСБ і Наркамасьветы з 2-га верасьня па 8-е сакавіка будзе праводзіцца дашкольны паход. Задача гэтага паходу ва многа раз павялічыць колькасьць дзіцячых устаноў, праверыць работу ўжо існуючых, прыцягнуць да пытаньняў дашкольнага выхаваньня ўвагу шырокіх мас работніц, батрачак савгасьніц і грамадзкіх арганізацый. Палепшыць якасьць выхаваньня дзяцей у дзіцячых установах.

Гэтым паходам кіруе штаб у складзе прадстаўніка Жанадцзелу ЦК КПБ, Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў, Наркамасьветы, Белжылсаюзу, прадстаўнікоў каапэрацыйных арганізацый. У час паходу павінны быць знойдзены сродкі для арганізацыі новых дзіцячых устаноў і будынкаў пад іх.

Усе грамадзкія арганізацыі, у тым ліку таварыствы „Прыхільнік дзяцей"—каапэрацыйныя арганізацыі і іншыя, павінны вылучыць сродкі ў карысьць дашкольнага выхаваньня. Жакты і кіраўніцтвы клюбаў павінны адвесьці памяшканьні для дзіцячых садоў і вячэрніх пакояў, якія будуць адчынены. Аддзелам народнай асьветы неабходна падабраць кадры працаўнікоў для дзіцячых устаноў. Гэтыя новыя працаўнікі будуць вярбавацца таксама з жаночага актыву гораду і вёскі, якіх трэба падрыхтаваць для работы па дашкольнаму выхаваньню. Дашкольны паход павінен стаць справай кожнай работніцы, калгасьніцы, савгасьніцы і ў першую чаргу актыву. Выбарны жаночы актыў і дэлегаткі на прадпрыемствах і ў тых арганізацыях, дзе кожная з іх працуе, павінны штурхаць справу дашкольнага паходу. На прадпрыемствах трэба арганізаваць групы садзейнічаньня паходу Групы гэтыя знаходзяць сродкі і памяшканьне для дзіцячых устаноў, арганізуюць суботнікі, лётарэі, спэктаклі для гэтай справы. Растлумачваюць значнасьць дашкольнага паходу, яго мэты і задачы работніцам, рабочым, савгасьніцам і калгасьніцам.

Ошарава.

ОБОРОНЯТЬ СССР ГОТОВЫ.

События на Китайско-Восточной железной дороге взбудоражили всех трудящихся Белоруссии.

На предприятиях среди рабочих, работниц только и слышны разговоры:

— Я первая запишусь в Краснук армию, я первый... и так без конца.

А как говорят,—„нюхавшие порох старые партизаны и бойцы Красно. армии,—говорят:

— Ничего, „еще не высох порох в наших пороховницах". Оборонять наше пролетарское отечество всегда готовы!



„Крылья Советов" на парижском аэродроме Ле-Бурже.

Молодежь заверяет своих старших братьев и сестер:

— Не отстанем от вас.

И вот ежедневно в наших газетах многочисленные списки добровольцев в Красную армию. Проводят отчисления в пользу бойцов Дальне-Восточной армии. Невозможно пересчитать всех, но только отметим:

Китайские рабочие г. Москвы собирают подписку на самолет „Крылья Контонской Коммуны".

На Краснознаменном заводе „Большевик", только один лайковый цех отчислил 52 рубля и вызвал все цеха завода, который дал 500 р.

Записались добровольцами в Красную армию комсомольцы обувной фабрики в количестве 43 чел., из коих около половины женщин; одиннадцать рабочих и работниц метровой мастерской, комсомольцы и беспартийные рабочие и работницы галантерейной фабрики, они же первыми отработали один день в пользу бойцов особой Дальне-Восточной армии; комсомольцы 1-й Гостипографии в количестве 25 ч., из коих также около половины девушек; члены колхоза „Красная Нива" в количестве 5 чел., среди них женщина—учительница.

Рабочие и работницы Швейной фабрики „Октябрь" отработали 3 часа для подарков Дальне-Восточным бойцам.

Рабочие и работницы конфектной ф-ки в Минске отработали 2 часа в пользу подарков бойцам Дальне-Восточной армии.

Работницы и трудящиеся крестьянки не отстают.

Нам нужно быть подготовленными всесторонне, чтобы в любую минуту быть готовыми оборонять страну советов от нападения наших врагов—всемирной буржуазии.

Трудящиеся женщины работницы, служащие, жены рабочих, трудящиеся крестьянки должны приобрести военные знания через военные кружки, санкружки, химические кружки и проч.

Все трудящиеся женщины должны вступить в члены Осоавиахима.

Будем готовы к обороне нашей страны.

На танк читателей „Правды"

По проведенной подписке на 194 экз. журнала „Беларуская работніца і сялянка" причитающиеся мне 10 проц. на сумму 34 рубля 92 к. передаю в пользу обороны СССР—фонд танка читателей „Правды".

Уполномоченный по „БСИКО"
Калиновский.

Минские работницы встречают Красную Армию из лагерей.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, праз дэлегацкія сходы, тысячы працоўных жанчын уцягваюцца ў актыўную працу па сацыялістычнай перабудове нашай краіны.

Рыхтуйцеся да перавыбараў дэлегацкіх сходаў.

Вырасьцілі Но

...Курсы сельсаведчыц пры ЦВК БССР.

Зьехалася 50 чалавек: з ліку якіх — тры не сябры с-саветаў; старшынь — 37, сакратароў — 10. Частка з гэтых грамадчыц маладыя, ня маюць дастатковага вопыту ў грамадзкай працы. Трэба пільна сачыць за іх клясавай вытрыманасьцю, выхоўваць іх на практычнай працы. Ёсьць і такія, якія яшчэ да выбараў у сельсавет у царкву хадзілі. Многія маюць за плячыма горы грамадзкай працы, загартаваныя ў клясавай барацьбе. Вось іх двое.

Трэпач Кацярына, старшыня Хоцімскага с-савету, Вульскага раёну, Полацкай акругі. Паведамляе яна аб сваёй працы непалохліва. Шырокі адкрыты твар, бла-

кітныя вочы заглядваюць у нутро. Гаворыць аб цяжкасьцях, аб нездавальненьні яе грамадзкай працы з боку мужа і дзяцей. Тут-жа перад маімі вачыма яна выймае лісты мужа і чатырнаццацігадовай дачушкі.

Пісьма гэтыя мне цяжка чытаць, гаворыць тав. Трэпач.

— Але-ж нічога ня зробіш. Перамелецца. Раней яшчэ горш было.

Муж прыехаў з фронту пасьля імпэрыялістычнай вайны, усталы, гаспадарка дрэнная. Толькі ў 1924 г. пры земляўпарадкаваньні прырэзалі зямлі. Зараз маю 7 дзесяцін.

Хадзіла на сходы. Была дэлегаткай жанаддзелу. Муж супярэчыў.

— А я пачую, што сход, дык аж калачуся, так хочацца ісьці.

Над сялянкамі-актывісткамі падсьмейваліся мужыкі і частка кабет.

Гаварылі, што я ляную ся на гаспадарцы працаваць.

Муж пагражаў, што пакіне мяне.

Я бывала досьвету ўстану, печку выпалю, гарод дагледжу, на полі папрацую, сена зграбу, усё спраўлю. Завяла сьвіней ангельскіх, пасеяла ў гародзе лепшых буракоў — урадзіла надта добра.

Вечарам бежкі на сход.

Аднойчы прышла позна дамоў. Муж у хату ня пусьціў начаваць.

У мяне натура добрая. Я растлумачыла, што і яму было раней кепска — змарыўся на фронце. Ён цёмны, малапісьменны, наслухаецца і піліць мяне.

Зараз ужо ня так. У гэтым годзе сельскагаспадарчую арцель організавалі. Я туды вайшла. Праўда, муж не зг.джа,ся, але-ж я вось што зрабіла:

Першымі організатарамі арцелі былі я і яшчэ дзьве сялянкі-бяднячкі—*Ганчарэнка Таць яна* і *Бакан Палагея*. Мы заўсёды разам—куды я, туды і яны. Склікалі сход.

— Хадзем, кажу мужу, цікава будзе.

Пашоў.

А на сходзе кажу: *калі мой мужык ня хоча ісьці ў калгас, сама з дзецьмі пайду*. Ён гэта пачуў як я сказала перад усім сходам, потым гаворыць мне:—пойдзем у калгас. Думаў, што я пакіну грамадзкую працу.

Зараз у апошнім лісьце піша:

— „Уведамляю вас, што ў нас у арцелі жанчынам многа лягчэй работаць, як пры адзіналічнай гаспадарцы".

...Вам ням чаго пісаць, бо вы мала цікавіцеся і ня жадаеце работаць на гаспадарцы, нават і *ў арцелі*. Пушчай адчуваецца муж з дзецьмі на рабоце..."

А дачка піша:

—„Мамачка, нам дужа скушна... Усю работу на мяне склала. Мне дужа цяжка работаць. Я бялізну мыю, у арцелі капусту абкапалі, печь таплю...

— Ня лёгка мне ўсё гэта, — гаворыць Трапач,—але-ж сваёй грамадзкай работы не пакіну. Раз мне партыя даручыла кіраваць с.-с. я да-

Грамадчыцы на курс

кажу, што можна пера

А цяжкасьцяй шмат.

Калі мяне абралі ста с.-с., які падтрымліва свайго швагра, дзе я *у мяне сьцягнулі пяч* насьмяхацца:—„Вось р працу ў с.-с.".

Я ня спалохалася. С усё гэта высьветлілася.

Прышлося паваяваць с.-г. крэдытнага т-ва Е загнуў ня ў наш бок. упарадкаваньня выраза тар, пабудаваў добрыя 2 каровы—набыў моц

Барадулін партыец. Райком КПБ. Адзін р у другі раз умяшалася дзілася. Зараз пры чы чылі, а потым васстана ў калгас, організавань

Зараз там 10 гаспа шыня праўленьня. Бед лу дапамагаюць у пр

Трэба пашырыць лік правесьці васеньнюю разьвітаньні гаворыцц трэба быць прыклад ходна апраўдаць дав

* * *

Койда Зося—старш ту, Лупаллўскага раё

Да апошняга часу пр

— Абралі ў дэлега хадзіла пакуль чаравік

Нават і ў сябры с

Сама дачка беднян манахінь і кулакоў.

Новыя кадры

Дэлегацкія сходы павінны зьяўляцца застрэльшчыкамі актыўнага удзелу жанчын ў сацыялістычным спаборніцтве ў горадзе і вёсцы.

Арганізуем шырокі агляд практычнай работы дэлегатак.

чы ўсе цяжкасьці.
се не пералічыш.
ынёй, былы сакратар
кулакоў, *падгаварыў*
ыла на кватэры, *каб*
ь з тым, каб потым
цяпа. Як ёй даручыць

алі пратакол, а потым

з былым старшынёй
адуліным. Ён таксама
ы правядзеньні земля-
сабе самы лепшы ху-
дынкі, 12 калод пчол,
гаспадарку.
адала заяву ў Вульскі
замазалі гэту справу,
Сі і ўсё гэта пацьверцы партыі яго выклюлі. Прапанавалі вайсьці
амі.
роў. Барадулін старта, дэлегаткі жанадддзе-
ы. Актыў яшчэ кволы.
нкты, хлебанарыхтоўкі,
ўбу,— аб усім гэта на
ав. Трапач. — Ну, мне
сябра партыі—неабпартыі.

*

ня Грэбенскага с-саве-
Магілеўскай акругі.
авала тэхнічкай у школе.
—гаворыць т. Койда,—
арвала, а потым кінула.
у не жадала запісацца.
а была пад уплывам

Манашкі яе навучылі шыць.

— Зарабляла ў школе мала, дык да позьней ночы шыю адзяяла, пакуль шыя забаліць.

Абралі мяне пасьля таго, як зьнялі з працы былога старшыню, *які растраціў 775 рублёў* і наогул з кулакамі ў адну дудку граў.

Пачала працаваць.

— Сяджу дзень, другі, сакратар таксама новы і ня ведаю з чаго пачаць.

Жлобіч — былы сакратар прыходзіць кожны раз і пагражае:—*„чакай, нашы магілеўцы цябе ўтопяць“.*

Заможныя заадно з імі, бо ён абдзяліў беднату, а надзяліў лугам заможнікаў.

У пачатку маёй працы, ён прышоў, парыўся нешта, напісаў паперку аб выдачы дзьвум сялянам лесу і даў мне падпісаць. Я падпісала.

Гэтыя двое сялян кулакі.

А потым ён прышоў і сьмяяўся над намі, што ўсё такі кулакі лесу атрымалі.

У другі раз Жлобіч прышоў яшчэ з адным кулаком—Караткевічам, напісаў даведку, у якой паменшыў сабе колькасьць зямлі, кароў і інш., сам прыглажыў пячаць і гаворыць мне: „Падпішы“.—Не, не падпішу.

„Хадзем,—гаворыць ён Караткевічу.— Што тут гаварыць з бабай ад печкі“.

Гэта было тады, калі я трохі ўжо пачала разьбірацца ў рабоце. Мы склалі пратакол і перадалі гэту справу ў РВК.

Іх потым арыштавалі і трымалі два тыдні ў ДПУ.

Зараз я працай вельмі зацікавілася. Бывае, што дні хаджу ня еўшы і бегаю з аднэй вёскі ў другую.

Здарылася так: — трэба тэрмінова зьбіраць грошы па самаабкладаньню, дагледзець, каб трыеры перачысьцілі насеньне да вясеньняй сяўбы. Грошы сабрала—памагаў сябра с-савету рабочы саўгасу.

З раз трэба сачыць, каб гэтыя грошы мэтазгодна скарыстаць. Дарогу строім, масты.

Зося Койда яшчэ кволая ў грамадзкай працы. Яна толькі ўцягваецца. Ёй патрэбна штодзенная дапамога. Яна яшчэ толькі нядаўна вышла з-пад уплыву царквы.

— Да выбараў у с-савет хадзіла ў царкву,— гаворыць Зося, а зараз і думаць аб гэтым няма калі“.

Яна проста расказвае аб сваіх памылках, *але трэба, каб яна стала пролетарскі вытрыманай, каб яна змагла ўпарта праводзіць клясавую лінію па сацыялістычнай перабудове нашай вёскі.*

Койда і Трапач,—абое захоплены сваёй працай.

Наогул усе слухачы курсаў пішуць, што „Курсы ім вочы адчынілі“. Пабольш дапамогі вылучэнкам у штодзенной працы.

Трэба замацаваць актыў.

Б. Дварэцкая.

Менску ў асяродку зьлева т. Гамарнік, Крэмер і Чарвякоў.

Трэба на старонках „Белрабсялянка“ шырэй асьвятляць, як дэлегаткі ўдзельнічаюць у сацыялістычным спаборніцтве, каляктывізацыі вёскі, хлебазагатоўках, як дапамагаюць ажыцьцяўляць пяцігадовы плян будаўніцтва сацыялізму. Пішэце, як дэлегаткі змагаюцца за пабудову новага, здаровага быту.

ПАРТЫЯ ЛЕНІНА СТАЛА ЯШЧЭ БОЛЬШ МАГУТНАЙ.

Шырокія колы батрачак, саўгасьніц, калгасьніц і працоўных сялянак дапамагалі партыі пазбавіцца ад нягодных элемэнтаў.

Камуністычная партыя праводзіць чыстку сваіх радоў ад тых, хто разлажыўся, абюракраціўся, перашкаджае індустрыялізацыі краіны; хто скажае класавую лінію, зрывае арганізацыю камун і калгасаў; хто абараняе інтарэсы кулацка-нэпманскіх элемэнтаў.

Зараз амаль па ўсёй Беларусі ўжо скончылі чыстку вясковых ячэек КПБ. На большасьці сходаў удзельнічалі шырокія колы працоўных сялян, сялянак, батракоў, калгасьнікаў, савгасьнікаў. Лепшая частка дапамагала партыі выкрыць скажаючых класавую лінію камуністых. Кулакі і кулацкія падпявалы імкнуліся аганьбіць лепшых таварышоў, але яны ў большасьці выпадкаў атрымлівалі адпор з боку сьвядомай часткі працоўнага сялянства. Працоўныя сялянкі, дэлегаткі аказалі значную дапамогу партыі, выкрывалі цэлы шэраг праступкаў, але-ж ня ўсюды яны прыходзілі на сходы. Мала былі падрыхтаваны дэлегаткі і таму яшчэ мала заяў ад лепшай часткі батрачак, бяднячак, савгасьніц і калгасьніц аб уступленьні ў рады партыі.

Аб дапамозе гавораць наступныя прыклады:

Талочынскі раён, Аршанскай акр. Чыстка ячэйкі В. Гарадзецкага с/с Старшыня сельсавету—**Піткевіч** не абараняў інтарэсы беднаты. Аб гэтым не палохаючыся паведамляе сялянка **Пархоменка**.

Што ён рабіў? Выдаў даведку дачцы кулака. што бацькі яе не карыстаюцца наёмнай сілаю; даваў заможнікам хлеб, крэдыты, а ў гэты час адмаўляў беднаце ў выдачы хлеба і крэдытаў. Усё гэта пацьвердзілася і Піткевіча з партыі выключылі.

Сябра партыі павінен быць прыкладам усюды, а ў калгасе імя XII зьезду КПБ (Талочына) сялянка Рашотнікава і іншыя адзначылі, што комуніст **Дальнякевіч** кепска працуе, п'янствуе, за што атрымаў суровую вымову.

Былі і такія выпадкі: у Валкавіцкім сельсавеце бяднячка-сялянка была падкуплена кулаком, каб выступіць супроць вытрыманага партыйца праводзячага правільную класавую лінію. Але на сходзе сялянкі-бяднячкі, выкрылі, што яна—кулацкі падпявала.

Жонкі камуністых дапамагаюць змагацца з п'янствам.

У ячэйцы чыгуначнікаў, жонка партыйца—**Пашкевіча** адзначыла, што муж яе ведаў аб тым, што каля іх патаемна прадаюць гарэлку і нікуды не паведаміў.

Жонка партыйца—**Пляца,** у Азерыцкім сельсавеце скардзілася, што муж яе б'е, п'янствуе.

У Навасёлкаўскай ячэйцы (Пухавіцкага раёну), калі праходзіла чыстка партыі старшыня сельсавету, былая дэлегатка жанадцзелу, супраць яе згуртавана выступалі кулакі і падкулачнікі. Затое дэлегаткі жанадцзелу і беднота за яе гарою стаялі. Яны гаварылі: –„Вось хто сапраўды набараняе інтарэсы беднаты". Многа яна дапамагала дэлегаткам у ліквідацыі няпісьменнасьці і інш.

Цікавае выступленьне старай работніцы савгасу Блонь.

„І скажу я вам,—гаворыць яна,—што вы ня зусім добра зразумелі Леніна. У нас у савгасе часта сваркі наконт разьмеркаваньня кватэр і іншай дробязі. А вось аб тым, як лепш кіраваць гаспадаркай, часамі, мала думаюць. Мне здаецца, што Ленін вучыў камуністых быць уперадзе ўсяго будаўніцтва, а нашыя савгаскія рабочыя не заўсёды так робяць".

У вёсцы Бабы, кулачка, якая мае 21 дзесяціну зямлі, жадала аганьбіць старшыню камітэту ўзаемадапамогі і разам з гуртом кулакоў і подкулачнікаў спрабавала сарваць сход. Але яны атрымалі належны адпор ад беднаты.

Ёсьць прыклады помствы з боку вычышчаных. Былы старшыня Радлянскага камітэту ўзаемадапамогі (Чэрвенскі раён) выстралам забіў бедняка-лясьніка, які выкрыў яго значынства.

Забойства бедняка **Кавецкага** выключаным з партыі **Чарвінскім** і шмат іншых прыкладаў. Усё гэта гаворыць, па-першае, аб вялікай дапамозе партыі з боку больш сьвядомай часткі працоўнага сялянства, батрацтва, аб іх згуртаванасьці вакол партыі, а па-другое, што класавы вораг ня сьпіць.

І гэта патрабуе яшчэ большай згуртаванасьці працоўных вакол камуністычнай партыі, у тым ліку і працоўных сялянак, батрачак, саўгасьніц і калгасьніц.

Ня зусім здавальняючым момантам зьяўляецца тое, што ў крытыцы працоўнымі сялянкамі і сельска-гаспадарчымі работніцамі паасобных камуністых, у выяўленьні цэлага шэрагу недахопаў, не заўсёды досыць увагі з боку сялянак было зьвернута на тое, наколькі той ці іншы камуніст дапамагае калектывізацыі вёскі і сам ідзе ў калгас. Гэта значыць, што яшчэ ня ўсе працоўныя сялянкі дастаткова ўцямілі сабе, што **камуністыя павінны быць першымі на вёсцы на чале калгаснага будаўніцтва.**

Па **Пухавіцкаму** раёну саўгасьніцы і калгасьніцы ўдзельнічалі на сходах па чыстцы, але-ж былі менш актыўнымі як сялянкі. Нао гул папярэдняя падрыхтоўчая работа сярод дэлегатак і жаночага актыву, аб іх удзеле і дапамозе партыі ў чыстцы сваіх радоў, у большасьці праведзена слаба. Там дзе падрыхтоўка была, удзел іх быў значна большы.

Пакуль яшчэ вестак аб колькасьці паданых заяў батрачкамі, сельска-гаспадарчымі работніцамі і працоўнымі сялянкамі аб уступленьні ў партыю—няма. **Па Талочынскаму раёну падана 3 заявы.** Гэта вельмі мала.

Чыстка вясковых ячэек паказала, што большасьць працоўнага сялянства, батрацтва і сельска-гаспадарчыя рабочыя ўцямілі мэту чысткі, дапамагалі партыі пазбавіцца ад нягодных элемэнтаў.

Зараз **лепшая частка** падала заявы **аб уступленьні ў партыю.**

Больш сьвядомыя, класава вытрыманыя калгасьніцы і савгасьніцы, батрачкі і працоўныя сялянкі таксама павінны вайсьці ў рады партыі, каб супольна з партыяй, пад яе кіраўніцтвам больш шпарка змагацца з кулацка-нэпманскімі элемэнтамі; праводзіць больш шпарка калектывізацыю нашай вёскі.

Ермалаева.

З фронту сацыялістычнага спаборніцтва.

Працуем, а спаборнічаць... некалі.

Савгас Блонь парашыў уступіць у сацыялістычнае спаборніцтва. Пастанову аб гэтым, як водзіцца, на паперы запісалі.

А зараз...

Запытайце ў рабочага ці работніцы:

— Вы ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва?

— Гаварылі нешта пра гэта на сходзе, але калі гэта было— даўно.

Пагаварылі і ўсё.

Рабочком тлумачыць:

— Некалі зараз. Збор ураджаю. Гарачая пара.

Выклікала Блонь на спаборніцтва савгас Цытва і Натальляўка, паслалі свае прапановы, вылучылі камісію, даручылі ёй умовы спаборніцтва заключыць. Цытва прыняла выклік, 8-га жніўня адказ прыслала аб гэтым. А справа на мейсцы: умова не заключана, камісія чакае чагосьці, пытаньне спаборніцтва ня досыць растлумачана рабочым савгасу.

У камуне „Зьвязда“ таго-ж раёну, яшчэ цікавейшая справа. Гэта камуна таксама парашыла ў спаборніцтва ўступіць, але зараз нават старшыня савету камуны адказвае:

— Аб спаборніцтве сацыялістычным? Ня ведаю я гэтай справы, у агронома куставога запытайцеся.

Агронома-ж добра калі раз у месяц пабачаць у вочы камунары. Бегае ён па свайму кусту, з калгаса ў калгас, зазірне ў „Зьвязду“ і бывайце здаровы.

Вынесьлі камунары пастанову „ўступіць у сацыялістычнае спаборніцтва“. За часам ня ўгонішся— пройшоў тыдзень з гакам. Прысылаюць з раёну сьвежага чалавека.

— Я ваш куставы аграном, буду значыцца абслугоўваць вас.

— А, так. Ну, дык дапамажы, браток!

Усклалі на агранома справы гэтыя: вывучыць магчымасьці далейшага разьвіцьця камуны, каб на гэтай падставе ўмовы сацыялістычнага спаборніцтва заключыць.

І пачаў куставы аграном „вывучаць“. Вось ужо месяц як ён „вывучае“, шукае роўную сілу, з якою-б камуна спаборнічаць пачала.

О-го-го, аграном! Колькі-ж часу ты, браток, яшчэ „вывучаць“, ды „роўную сілу“ шукаць будзеш?

А камунары тым часам працуюць, стараюцца. Вось ужо жыта прыбралі, амаль змалацілі, васеньнюю сяўбу распачалі.

Работніцам Блоні, камунаркам „Зьвязды“ трэба не саромячыся штурхнуць абраную камісію, лятучага агранома і савет камуны. Трэба ведаць, што сацыялістычнае спаборніцта не часовая справа, якую можна будзе выканаць адным узмахам, „у вольныя дні“, пасьля збору ўраджаю. Трэба безадкладна арганізаваць гэту справу, каб рабочыя савгасу і камунары кожны крок свае працы будавалі на падставе ўзятых у спаборніцтве абавязкаў.

В. Х.

Пухавіцкі р-н, Меншчына.

Гультаёў, перашкаджаючых будаваць—вон з калгасу!

Нацыянальны калгас „ОРТ“ уступіў у сацыялістычнае спаборніцтва. Каляктывісты ўзялі на сябе такія абавязкі:

На 30 проц. павялічыць прадукцыйнасьць стада, сваечасова і добра правесьці васеньнюю сяўбу, павялічыць недзялімы капітал, адлічваючы 10 проц. ад чыстага прыбытку, арганізаваць дзіцячую пляцоўку, пабудаваць клюб, арганізаваць гурткі: палітычны і сельска-гаспадарчы, больш разгарнуць агрыкультурную працу сярод насельніцтва акаляючых вёсак. Бядняцтву і серадняцтву аказваць гаспадарчую дапамогу, абменьваючы насеньне і даючы неабходныя сельска-гаспадарчыя машыны.

Выкананьне ўсіх гэтых умоў узмоцніць гаспадарку нашу на 25%.

У распрацоўцы ўмоў сацыялістычнага спаборніцтва калгасьніцы прымалі самы актыўны ўдзел, абмяркоўвалі, самі ўносілі прапановы, аб палепшаньні працы ў гаспадарцы „ОРТ“.

Мы зараз ужо прыступілі да выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў.

Амаль усе калгасьніцы выходзяць на працу. Але маюцца сярод калгасьніц і такія, як Оля Бярковіч, якая заводзіла розныя спрэчкі ў час працы, а за апошні час зусім ня ішла на працу. Гэта прымусіла нас выключыць яе з сябраў калгасу.

Мішкіна Даша.

Магілеўская акруга.

Первая женщина в БССР—секретарь райпарткома.

Тов. Аронаву—работницу Минска хорошо знают по ее работе



тов. Аронова.

зав. женотделом Фрунзевского райкома КП(б)Б. Хороший товарищ, стойкий, выдержанный большевик.

Тов. Аронова работница-портниха. Двенадцать лет она гнула спину в разных швейных мастерских. В 1919 г. тов. Аронова вступает в партию. Работала она в разных местах на партийной работе. Была зав. женотделом Горецкого райкома, зав. женотделом Оршанского окружкома. В последнее время тов. Аронова работала в Минске в качестве зав. женотделом Фрунзевского райкома КП(б)Б.

Недавно минский окружком КП(б)Б выдвинул тов. Аронову на партработу в качестве секретаря Смолевичского райкома КП(б)Б. Единогласно Смолевичская райпартконференция выбрала ее.

Тов. Аронава—первая женщина в Белоруссии секретарь райпарткома.

Галка

А трава зеленая...

Рассказ Галки.

Встречались на кладбище. Где же им больше деваться.

У Тани полкровати—вся жилплощадь; ее временно приютила в свою маленькую комнатушку Дуня, уступив половину кровати. Степа же хоть имел угол, но разве можно к нему заходить.

О, если бы мать знала, что сын ее с Таней вечера коратает. Долгие годы заботливо оберегаемые Стрижневской отрепья чести старой чиновницы заговорили бы громко. Она не только не пустила бы на порог Таню, но и для родного сына двери ее дома оказались бы закрыты крепко-накрепко.

Кладбище за больницей, где Таня работала кухаркой, было более гостеприимным местом: просторно, а главное безлюдно, лишний глаз не подкарауливает.

Хорошо!

Набегается Таня за день, руки и спина ноют от чугунов и котлов; помоется, чистую кофту оденет и по узкой тропинке, которая бежит далеко, далеко, прячется в ржаных полях, прямо на кладбище, в условленное место.

Иногда поджидать приходилось Степана. Тогда Таня садилась на старой пригнутой к земле березе, у края обрыва, скользила глазами по бугоркам могильных насыпей, думала: „Вот, сегодня живешь, а завтра... кто его знает, может и не станет тебя, так-таки совсем, как не бывало".

Жуть пробегала. Холодно.

Хорошо бы вечно жить, ух как хорошо!

А вечер сегодня такой бархатный. Ветер теплый ласкает шею и голые руки Тани, шевелит золотые кудряшки на лбу. Дразнит медовый запах гречихи, васильков. А воздух, после угарной кухни, кажется особенно чистый.

А вот и Степа-синеглазый, стройный, с растегнутым воротом белоснежной рубашки. Таня издали, не видя еще, узнала его по всегда торопливой походке. И не ошиблась. Сквозь свежую зелень кустов показывается его маленькая голова, с золотым завитком, выбившимся из-под тюбитейки.

Лицо Тани засветилось улыбкой, долго, долго не тающей.

Потом сидели рядышком, тесно прижавшись. Выхоленной ладонью Степа гладил волосы Тани, жал шершавую руку, перебирал пальцы и тихо шептал:

— Танечка, какая ты дикая. Ты не бойся, ребенка от меня быть не может, врачи говорят, ей право.

— Почему ты заговорил об этом,—удивленно спрашивает Таня.

— Да как тебе сказать. Потому, потому, ей право, девчата ребенка как огня боятся.

— А ты?

— Я. Я не думал об этом, ей право,—прижимая руку к сердцу, говорит Степа.

— А как я вообще смотрю на этот вопрос, ты же знаешь. Помнишь как брал в оборот Пипкина.

Перед Таней всплывает, еще так свежая, история с Пипкиным—сыном местного кустаря. Прижил он Ирине ребенка, а потом отказался. Та чуть было на плохое не решилась, да поддержали ребята. На делегатском собрании обсудили вопрос, здорово грели Пипкина, особенно горячо осуждал его Степа. Потом на суде доказали отцовство—заставили платить на воспитание малыша.

— Ты о чем задумалась Танечка, заглядывая в глаза, спросил.

Тане захотелось поделиться.

— Степа, ты помнишь Стасика Янского, студента, который приезжал иногда летом к нам. Только ты никогда никому не скажи, дай мне слово об этом.

— Что ты, Танька, ей право. За кого ты меня принимаешь.

— Ну, вот! Таня глотала что-то, как будто мешавшее ей говорить.—Это был первый парень, с которым я жила как с мужем. Знаешь мою жизнь. Родителей не помню, с малых лет по людям, домашней работницей. Тяжело, каждый хозяин.

А он умный, ученый, а главное добрый, ласковый такой. Любила я его. Еще девченкой 16 лет была. Думала замуж возьмет, наниматься не буду. Он обещал, а потом...

На ресницах Тани заблестели слезы.

— Никогда не забуду его. Даже еле здоровался при встрече потом. Я же стала ходить на собрания, потом делегаткой избрали меня, поручили работу, грамоте стала учиться. Понемногу забылось. А он и сейчас где-то учится.

— Ай, Танька, брось ты ныть! Что ты сегодня такая? Был, сплыл, еще будет—подумаешь, горе какое! 18 лет девке, а ноет как старуха. И вообще плохо, когда девчата начинают киснуть.

На улице послышались шаги. Щелкнула калитка. Кто-то насвистывал веселую песенку. В темноте мелькнул огонек папироски.

— Уйдем, я не хочу, чтобы видели нас.

— Верно. Лучше спать. Скучная ты сегодня, ей право.

Проводил домой. Ушел, пожав крепко руку.

— Завтра увидимся. Ты выспись хорошенько.

А Тане не спалось. В саду на скамье долго, долго сидела она; смотрела на поле, на небо, следила за звездами, они так красиво-

блестели, как чистые, ясные глазки ребенка. Спало местечко. Тихо о чем то шептала листва.

Когда листья золотились.

Тонкое кружево белой паутины скользило в воздухе. Лето убегало, пряталось. Листья кустов и деревьев запестрили красной и желтой окраской. Заглядывая в зеркало Таня следила, как всегда свежее прежде лицо ее все гуще усеивают желтые пятна.

И не грустно было ей. Стала более бережливой, старательно мыла изношенное белье, аккуратно укладывала в отдельную корзинку.

Со Степой встречались все реже, дождливые вечера не пускали на кладбище.

— Ты совсем ужинать перестала,—говорила ей Дуня.—Все же 25 руб получаешь, можно не голодать. Мне кажется, что ты деньги копишь.

Таня молчала.

— У тебя все наоборот: у людей веснушки весной появляются, а у тебя осенью—приставала Дуня.

— Ты откуда пришла сейчас,—перевела разговор Таня.

— А ты мне разве говоришь где ходишь? В ячейке была я. Говорили там о Степе.—Плохое говорили, даже об исключении ставили вопрос. Оторвался, на собрания не ходит, работать не хочет. И вообще он такой парень, что...

— Ну, а Степа, что говорил?

— Оправдывался.

— И что решили?

— Пока ничего. Он все об'яснял подготовкой к от'езду.

— Куда?

— Совсем из Белорусии ведь он уезжает. Между прочим квартира освобождается. Как у тебя квартирные дела. Тесно будет здесь нам зимою. Да и неудобно тебе и мне.

— Не беспокойся, Дуня, рожу так уйду. С ребенком не буду здесь у тебя.

Крупные капли дождя барабанили в стекла единственного окна. Дуня прошлась по комнате, зажгла свет, закрыла форточку и не, отходя от окна, спиной повернувшись, небрежно спросила.

— Ты не шутишь. Неужели ребята говорят верно?,

— Чего притворяешься?! А сама почему о пятнах на лице спрашивала, почему о квартире сказала заботиться?

— Степан?

— Да.

Тени лохматые...

Перед от'ездом вместе провели вечер.

— Ты прости меня Таня, не обижайся. Я бы остался, не уезжал, но матери надо помочь. Дом продаем. Я вернусь еще наверно, только их там устрою.

— Я и не сержусь Степа. Только ты от ребенка не отказывайся—твой он, пусть и люди все знают, чтобы блудящей меня не считали. Адрес свой мне запиши.

— Да адреса я и сам не знаю пока, ей право; вот заеду, тогда и сообщу.

Сомнение промелькнуло в голове Тани.

— Да как же ты едешь и сам не знаешь куда?

Потом успокоилась. Что-ж, может быть и не знает точного адреса.

Домой вернулась рано. Не раздеваясь легла на кровать, плотно задернув полог, отделяющий кровать от остальной части комнаты.

По стенам ползли тени серые, длинные, лохматые; ближе подвигались, одна на другую грудились. Жутко. Тяжело становилось дышать.

— Ну, что-ж,—думала Таня,—рожу, а что дальше делать буду? Степа уезжает, кто знает вернется ли. Одной тяжело. А ведь можно так просто освободиться от беременности.

Аборт—мелькнуло в голове Тани. И тут же вырисовалось несколько знакомых женских лиц,

Иногда поджидать приходилось.

желтых, худых. Она видела этих женщин в больнице, после абортов. Вспомнила слова врача, когда он говорил: „Первую беременность прерывать особенно вредно“. И тут же вспомнила счастливых матерей с новорожденными.

Уплывали тени. Таня представляла себя матерью, с розовым, здоровым малышом на руках. Вот пухленькие, точно ниточками перетянутые в суставах, рученки тянутся к Тане, шею охватили и так нежно ребенок прижимается к ней. Ласка ребенка такая искренная, чистая, родная, личико улыбается, а на левой щеке такая милая ямочка.

Улыбаясь задремала Таня.

Сети расставлены.

Степа молчал.

Узнать бы адрес. Решила пойти к его дальней родне, кстати поговорить о квартире.

Обрюзгший, рыжий лавочник открыл двери. Заплывшие глазки его беспрерывно мигали, потное лицо имело недовольный вид.

— Адреса нет у меня, не писал ничего племянник,—сказал и подозрительно с ног до головы смерил Таню.—А вот насчет квартиры, так это есть, только не знаю сойдемся ли в условиях. Комната хорошая и недорогая, но видите ли голубчик...—рыжий замялся, затем, переступая с ноги на ногу, продолжал:

— У меня дело маленькое, торговля значит. Какая там торговля, рубль торгуем, два—харчуем, но все же деньги нужны. И я думаю сдать комнату только тому, кто внесет мне сотни полторы хотя, взаймы выходит, а за проценты—жить будет. Мои условия хорошие.

Таня повернулась, чтоб уходить.

— Вы все же подумайте голубчик. Комната—лучше быть не может. И главное даром жить на проценты,—опять заморгал заплывшими глазками.

Возвращаясь домой, Таня думала:

— Денег то я собрала бы: за отпуск, за роды и кой-что скопила. Но неудобно дать ему в займы для торговли, частника поддерживать значит. Вспомнилось делегатское собрание, когда говорили о том, что средства трудящихся нужны государству. Таня сама тогда выступала за сберкассу.

Вы все же подумайте.

Дуни не застала дома—ушла на работу. На столе лежал запечатанный конверт. Вскрыв его Таня нашла там адрес Степы и записку Дуни. „Раздобыла адрес. Он, говорят, устроился не плохо. Зарабатывает“.

Села и еле грамотной рукой написала: „Степа, я скоро должна родить. А ты не пишешь даже. Обидно мне и тяжело. Квартиры нет, не знаю, где денусь с ребенком, если жива останусь. Что-то плохо мне. Твоя Таня“.

Одинокая она.

Еле двигалась Таня.

— Двойня наверно,—шептали соседи.

— Добегалась, куда теперь дѣнется,—повизгивали местечковые сплетницы.

— Не беда,—поддерживали некоторые.

Месяц отпуска особенно томительно проходил. За работой дни уплывали более быстро, а тут на тебе: день твой и вечер твой.

На делегатском собрании заговорили.

— Что-то Таньки давно, не видать: на собрания не является, порученную работу забросила. Что толку с такой делегатки.

— А вот погоди, посмотрим за что отчитываться будет.

— Известно за что. Сразу она очень горячо взялась за дело: в ликпункте училась, мопровскую работу наладила.

— Ну, а сейчас не работает, надо было о переизбрании давно поставить вопрос.

— Какая ты быстрая—„переизбрать,“—отозвалась Хана Эпштейн.—А может ей тяжело работать сейчас. Таня родить должна, а они к ней с собраниями. С работой пока без нее обойдемся.

— Тоже не верно говоришь. Если мы без нее обойдемся, то может быть ей без нас тяжело. Одинокая она, а соседушки там разное нашептывают, надо было бы побеседовать с нею, помочь.

Продолжение рассказа „Сделка“ будет напечатано в следующем номере. Желательно, чтобы читательницы высказались по существу рассказа.

НЕ МЕШАЙТЕ СТРОИТЬ!

Для фабрики им. ВОРОВСКОГО директивы партии о выдвижении работниц не писаны. Осенне-посевная кампания на носу, а Круглянская сельско-хозяйственная кооперация дремлет, минерального удобрения и необходимых машин не завозит. Бюрократы из „ДНЕПРА“ душат хорошую инициативу жен рабочих.

Не перашкаджайце павышаць ураджайнасьць.

Кепска рыхтуюцца да сяўбы каапэрацыйныя і іншыя арганізацыі Круглянскага раёну. Гэта адзначылі ў спрэчках сябры Саветаў жанчыны на нарадзе, якая была нядаўна праведзена.

Сельска-гаспадарчая кааперацыя не сваячасова завозіць мінэральнае ўгнаеньне і неабходныя машыны, як жняяркі, малатарні, машыны, для перачысткі насеньня і інш. Былі выпадкі, калі не дачакаўшыся затрэбаваных машын, нават калгасы прымушаны былі купляць машыну ў кулака, машыну падтрыманую, якая хутка прыходзіла ў нягоднасьць.

— Насенна-ачысьціцельныя абозы не заўсёды досыць нагружаны—казалі грамадчыцы. Трэба сачыць за тым, каб машыны былі поўнасьцю нагружаны. А каб ачысткай насеньня ахапіць ўсё сялянства, трэба прыцягнуць у дапамогу дэлегатак і ўвесь жаночы актыў.

Вось якія прапановы—для лепшай падрыхтоўкі вясеньняй сяўбы—ўнесла нарада грамадчыц нашага раёну.

Аршанская акруга.

Пясьняк.

Работниц вытесняют.

Мало внимания наша фабричная организация обращала на втягивание женщин в общественную работу. Работницы фабрики знают только свое производство и больше ничего. В общественной работе они отстали.

Беда в том, что работницам не дают работать мужчины. Если избирают работниц в те или другие организации и на первое время она не так хорошо сделает доклад о своей работе,—начинают смеяться.

Работницы малограмотные, есть и неграмотные.

В нынешнем году организовали три экскурсии—две по социалистическому соревнованию, а одну за счет Центрального Правления Бумажников. Ни на одну экскурсию, по мнению рабочих мужчин, нельзя послать р-цу. Одна из работниц на собрании сказала, что и работницы интересуются своим производством, нужно и от работниц послать на экскурсию. Но это предложение осталось пустым звуком. А рабочий Ильин, коммунист, говорил: „Что работницы нам дают, они, мол, плетутся в хвосте, отсталые“.

Мы плетемся и будем плестись в хвосте, ибо у нас Ильиных много. Наши рабочие на сегодняшний день не хотят согласиться с тем, что и женщина может работать наравне с мужчиной как на производстве, так и на общественной работе. Пора нашим рабочим это уяснить себе.

Работница.

Ф-ка им. Воровского.
Витебский окр.

За пісьменнасьць!

З першага верасьня пачынаецца месячнік „за пісьменнасьць“.

У час месячніка намечана пашырыць сетку лікпунктаў, вярбаваць новых сябраў таварыства „Прэчь няпісьменнасьць“, падрыхтаваць новых ліквідатараў няпісьменнасьці.

Жанчын няпісьменных у нас на Беларусі ў 2 разы больш як мужчын.

На кожныя 100 мужчын, 58 пісьменных, на кожныя 100 жанчын—толькі 28 пісьменных.

Жаночы актыў, дэлегаткі жанадцзелу, павіны прымаць актыўны ўдзел у правядзенні месячніка, дапамагчы вучоту няпісьменных, ахапіць іх лікпунктамі.

Лезунг—100-працэнтная ліквідацыя няпісьменнасьці сярод арганізаванага працоўнага насельніцтва павінен быць праведзен у жыцьцё. Гэта датычыцца ў першую чаргу дэлегатак жанадцзелу, грамадчыц, работніц заводаў і фабрык, савгасьніц, калгасьніц і камунарак.

Арганізуйце сацыялістычнае спаборніцтва на 100% ліквідацыю няпісьменнасьці сярод жанчын паміж фабрыкамі і заводамі, савгасамі і калгасамі, камунамі, дэлегацкімі сходамі. Каб у 1930 годзе ня было ніводнай няпісьменнай сярод р-ц, калгасьніц і камунарак.

Няхай адна вёска выклікае другую на сацыялістычнае спаборніцтва, на большы ахоп няпісьменных жанчын лікпунктамі.

Пішыце нам у часопісь вашы выклікі, што дзе зроблена ў галіне пашырэньня лікпунктаў і ахопу няпісьменных.

Вот как душат энтузиазм масс.

Жены рабочих, живущие в фабричном районе, организовали воскресник—решили 6-го августа поработать в фонд индустриализации. Все явились на фабрику. Но заводоуправление отобрало только человек 15—бывших работниц-с'емальщиц и поставило их на работу. Остальных же—3 с лишним десятка человек—отправили обратно домой.

Неполучившие работы были возмущены, требовали работы, негодовали на то, что неквалифицированной жене секретаря партколлектива все же нашлась возможность предоставить работу, остальным женам рабочих—нет.

А работу можно было всем найти. В каждом цеху есть подсобные работницы, которых можно было поставить на с'емке, заменив их на один день женами рабочих.

Наше заводоуправление бюрократически отнеслось к желанию жен рабочих свой труд отдать в фонд индустриализации страны. Особенно недопустимо такое отношение со стороны пом. директора фабрики, выдвиженки-работницы Рабинович.

Жены рабочих требуют привлечь к ответственности бюрократов. Жены рабочих требуют, против желания бюрократов, устроить все же воскресник, всю выработку от которого отдать в фонд индустриализации страны.

О. Мамет.

Фабрика „Днепр“ и „X Октябрь“

падвоім ураджай

Коопэрацыйны актыў, у паход за колектывізацыю!

Перавыбары ў сельска-гаспадарчай коопэрацыі, якія адбыліся ў маі-чэрвені г. г., узварушылі ў значнай ступені батрачак, бяднячак і сераднячак—сялянак.

У малочна-жывёлагадоўчай коопэрацыі, у якой сялянкі павінны прыняць значны ўдзел, на 1-е кастр. было 3650 (13%) коопэраваных сялянак, а да часу перавыбараў было ўжо ў два разы больш: 6636 жанчын або 17,5%. Але-ж калі прыняць пад увагу, што трэба коопэраваць у гэтым годзе ня менш 25% сялянак, дык тое, што зараз маем, ня зусім нас задавальняе.

Яўка на справаздачна-перавыбарчыя сходы с.-г. крэдытнай коопэрацыі складае 10,5%, а па малочна-жывёлагадоўчай—20%. Апрача пайшчыц, на сходзе ўдзельнічалі і сялянкі ня-пайшчыцы.

Па крэдытнай коопэрацыі агульная яўка сялянак складала 12% (28000 жанчын), а па малочна-жывёлагадоўчай—24% (8000). Такім чынам, мы бачым, што працоўная сялянка зацікавілася работай с.-г. коопэрацыі, што яна стала прыймаць удзел у вырашэньні пытаньняў перабудовы сельскае гаспадаркі на новы соцыялістычны лад. Пайшчыцы актыўна ўдзельнічалі ў перавыбарчых сходах, выступалі ў спрэчках па справаздачах.

Выбары ў кіруючыя ворганы коопэрацыі далі значнае павышэньне ўдзелу сялянак. Па с.-г. крэдытнай коопэрацыі ў мінулым складзе было ў праўленьнях 2,7 проц. жанчын, а сёлета—13,6 проц. Значна выросла колькасьць жанчын у рэвізыйных камісіях, саветах сельска-гаспадарчай коопэрацыі.

Па малочна-жывёлагадоўчай коопэрацыі ў мінулым складзе было ў Праўленьнях 3,1 проц. (а сёлета 20%). Усё гэта дае тры з паловаю тысячы коопэрацыйнага актыву.

Зразумела, што справа ня можа абмяжоўвацца толькі тым, што нейкая частка найбольш актыўных пайшчыц абрана ў кіруючыя ворганы. Трэба іх так падрыхтаваць, каб бяднячкі і сераднячкі маглі прыняць самы актыўны ўдзел у кіраваньні справамі сельска-гаспадарчай крэдытнай і вытворчай малочна-жывёлагадоўчай коопэрацыі.

Па-першае, трэба ліквідаваць няпісьменнасьць сярод коопэрацыйнага жаночага актыву, абавязкова ўцягнуць яго у лікпункты.

Па-другое, трэба ўзьняць агульны культурна-палітычны ўзровень бяднячак і сераднячак, абраных у ворганы коопэраваньня, праз чыткі, гутаркі, даклады, лекцыі, якія павінны праводзяцца на вёсцы, у хатах-чытальнях, чырвоных куткох, пры школах.

Па-трэцяе, кожная абраная актывістка павінна атрымаць практычную работу, яна павінна ведаць, што ёй рабіць, за што адказвае, удзельнічаць у пасяджэньнях, нарадах, камісіях па коопэрацыйных пытаньнях.

Агрономы, настаўнікі, вэтэрынарны пэрсонал, ва ўсёй сваёй агрыкультурнай і культурна-асьветнай рабоце павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на перавыхаваньне бяднячак, сераднячак-актывістак, сельска-гаспадарчай коопэрацыі дамагацца таго, каб яны ў першую чаргу правялі ў сваіх гаспадарках прасьцейшыя агрыкультурныя мерапрыемствы.

Коопэрацыйны актыў павінен быць застрэльшчыкам па вытворчаму коопэраваньню вёскі, організацыі колектываў, быць прыкладам, цягнуць за сабой бедняцка-серадняцкія жаночыя масы.

Лібман.

Сейце азімае радавым сяўніком.

У мінулым годзе хто-колечы з сялян Сьмілавіцкага раёну, Менскай акругі, пасеялі па кавалку поля радковым сяўніком. Па абмалоце параўналі ўраджай з атрыманым з гэткай-жа плошчы, пасеянай у роскід рукамі, дык у выніку ўвесну гэтаго году ўжо 7 радавых сяўнікоў працавалі на іх нівах,—паведамляе аграном таго раёну.

Сяўнік—дарагая машына, ад 100 да 300 руб. каштуе. Можна яе набыць каляктывам.

Многа розных прылад і машын ужываецца ўжо цяпер сялянамі. Плуг замяніў саху, жалезная барана—дрыўляную, амаль ва ўсёй краіне. Арфы, сартоўкі, малатарні гудуць у многіх гаспадароў, увосені некалькі дзён, а ня похкае цэп на таку амаль усю зіму. Няхай хто цяпер паспрабуе даказаць, што саха ня горш плуга або малатарня—за цэп? Ды кожны гаспадар, што ўжывае плуг ці малатарню, такога даказчыка засьмяе.

А вось для пасеву адвеку ўжываецца ўсё той-жа саламяны ці лубяны сяўнік і жменя гаспадара. Гэты спосаб пасеву існуе толькі таму, што сяляне ня мелі радавога пасеву. Можна быць упэўненым, што, *хто толькі раз паспрабуе сеяць у рады, той больш сеяць рукамі ня будзе, а прымусіць працаваць за сябе машыну*, як гэта робіцца ў Нямеччыне і іншых эўрапэйскіх краінах.

Адмоўныя бакі ручного пасеву.

Для расьліны патрэбна сьвятло, спажыва, вільгаць і глеба, дзе яна расьце і адкуль бярэ спажыву. Вядома, што які-б ні быў спрактыкаваны сявец, расьсеяць рукамі так, каб зярняты паклаліся на аднолькавай адлегласьці адно ад другога, ніколі ня здолее. Заўсёды ў адным месцы ўпадзе больш зярнят, а ў іншым застанецца, хоць і невялічкая на погляд, але голая пляма. Больш цяжэйшыя зярняты

пры пасеве рукамі адлятаюць далей ад сейбіта, а лёгкія падаюць каля яго ног, ад чаго пасеў мае часта грывасты выгляд.

Неаднолькавая глыбіня, на якую падаюць пасеяныя ў роскід зярняты пры баранаваньні, таксама па рознаму адбіваецца на ўсходах, а ў далейшым і ў часе росту на расьлінах. Ад зерняці, якое забаранавана глыбока, першы лісьцік часта ня здолее выбрацца з глебы і гіне. Частка ўсходаў ад глыбока захаваных зярнят хоць і выбіраецца на паверхню глебы, да сьвятла, але яны дужа зьнясільваюцца і ў далейшым адстаюць у росьце. Шмат зярнят застаецца зусім на паверхні глебы. Яны або засыхаюць, таму што ім не хапае вільгаці для ўсходаў, ці зьядаюцца птушкамі. З тэй прычыны, што ня ўсе зярняты пры ручным пасеве трапляюць у спрыяючыя ўмовы і таму ня ўзыходзяць, прыходзіцца, папершае, траціць на пасеў лішак насеньня, а па-другое, розная глыбіня зьяўляецца прычынай для неаднолькавых усходаў і разьвіцьця расьлін.

Неаднолькавыя ўмовы для росту зьяўляюцца прычынай для неаднольковага красаваньна збожжа, наліву і пасьпяваньня зерня, што ўвогуле вядзе да зьніжэньня ўраджаю.

Згрупаваныя разам гушчыня пасеву і глыбіня, дзе ў бок горшых ўмоў для росту, дзе лепшых, і выклікаюць стракатасьць поля. Таму і бывае на палетках так званая праскалосіца, калі адны быліны і каласы сьпелыя, а іншыя яшчэ зяленыя, зерня ў наліве. Бывае, што і зусім яны не дасьпяваюць. Салома з гэтай прычыны бывае таксама розная, поруч з чароцістай, атрымліваецца падобная на мятліцу.

Пры ручным роскідным пасеве наглядаецца ў большым ліку празерніца. Гэта тое, што ня ўсе зерняты на коласе, ня ўпрыцён завязваюцца і вырастаюць. Колас пры гэтым атрымліваецца рэдкі. Паміж зернятамі на коласе застаюцца пустыя месцы.

Праз неаднолькавыя ўмовы для прарастаньня ўсходаў і далейшага росту расьлін, ня ўсе зерняты дасьпяваюць да часу жніва. Зяленае, недасьпелае зерня нявымалачаным застаецца ў саломе, а калі і вымалаціцца, дык пападзе ў пазадкі або ў мякіну. *Усе гэта зьніжае ўраджай, а з тым і прыбытак гаспадарцы.*

Чым карысны радавы пасеў.

Радавы сяўнік кладзе ў глебу зерняты на аднолькаваю глыбіню, чаго немагчыма выканаць пры раскідным пасеве. *Пасеяныя ў рады зерняты дружней, адначасова ўзыходзяць, пэрыяд ўсходу не расьцягваецца на доўгі тэрмін.*

Страт здаровых зернят пры радавым пасеве ня бывае. Ня ўзыходзіць толькі пабітае, недасьпелае і тое насеньне, што страціла ўсхожасьць пры захаваньні.

АДКАЗЫ НА ЗАПЫТАНЬНІ.

ГОТЛІБОВІЧ. Калі я хочу выйсьці з арцелі, то ці маю права на атрыманьне азімага ўраджаю, прапрацаваўшы там з студзеня да лістапада месяца.

Адказ.

Згодна 18-га артыкулу статуту арцелі, кожны сябра арцелі пры выхадзе з яе мае права на атрыманьне ўзнагароды за працу ў арцелі, а таксама і на атрыманьне свайго пая і ўзносу, апрача часткі, якою папаўняецца прыпадаючая на яго долю страта арцелі, вызначаная пад канец гаспадарчага году.

ПЕТРАЧЭНКА МАРКУ. Аб няправільна накладзеным індывідуальным абкладаньні.

Адказ.

Калі ў гаспадарцы гр. Петрачэнкі сапраўды ўжываецца толькі 13 наёмных рабочых дзён (за ўвесь год), а іншых прыкмет, якія па пастанове АВК служаць падставай для індывідуальнага абкладаньня ня маецца, дык гаспадарка індывідуальнаму абкладаньню не падлягае. У такім выпадку трэба падаць скаргу ў райпадатковую камісію.

БІРУКОВІЧ ГАЛІ. Чым можна лячыць каросту, акрамя сьмярдзючай мачы, якая вельмі псуе бялізну.

Адказ.

Вельмі часта каросту зьмешваюць з іншымі **скуранымі** хваробамі, бо распазнаньне гэтых хвароб ня так лёгка, як многія лічаць. Таму пры ўсякіх выпадках захворваньня **скуры** мы раім зьвярнуцца ў бліжэйшую раённую бальніцу, ці амбуляторыю. Там доктар распазнае хваробу і назначыць належнае лячэньне.

Завочнае лячэньне, ня бачыўшы хваробы, мы не рэкамэндуем.

Урач **Шапіро**.

АДЗУНЕЦ ПРОСІ. Як падрыхтавацца для паступленьня ў рабфак.

Адказ.

Найлепш для гэтага трэба паступіць у вячернюю школу, якія маюцца ў раёнах. Калі вучыцца ў гэтай школе ў вас няма магчымасьці, дык параім вам на конт падрыхтоўкі ўмовіцца з мясцовым настаўніцтвам, папярэдне раздабыўшы праграму патрабуемых для паступаючых у рабфак ведаў.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Піскуну Міхасю. Ня пойдзе. У вашых допісах агульныя разважаньні. Выразных фактаў няма. Вось напрыклад ваша карэспандэнцыя „Першы сноп на адбудову краіны“. З допісу ня відаць аддалі сялянкі гэтыя снапы каму ці зусім не аддалі. А нам патрэбны яскравыя факты, што сялянкі такой вёскі тое ці іншае практычна зрабілі. Трэба пісаць сапраўдныя факты адмоўныя ці дадатныя.

Каваленка. Карэспандэнцыю друкаваць ня будзем. Пішыце аб вашай працы ў сельсавеце.

Хаміцкай. Пішыце, як грамадчыцы праводзяць у жыцьцё пастановы нарады аб арганізацыі дапамогі бяднячкам у васеньнюю сяўбу, аб ачыстцы насеньня, уцяпленьня хлява і інш.

Кабеце. Факт аб хуліганстве напішыце лепш у насьценгазэту.

Златкінай П. Як дэлегаткі дапамагаюць МОПР—напішыце у насьценгазэту.

В. Красьнер. Вы пішаце, што добра працуе ўрач кансультацыі, але з допісу ня відаць, якую-ж працу яна праводзіць. Аб самым галоўным, гэта аб рабоце ясьляў, аб становішчы іх, той карысьці, якую ясьлі далі працоўным—вы нічога ня пішаце. Трэба пісаць не агульна „Дапамагалі выхаваць зьмену“, а даць прыклады гэтага, адначасова зазначыўшы і слабыя бакі працы.

М. Матэйка. Ваш допіс аб камуне мы скарыстаем. Але для гэтага напішыце нам больш падрабязна аб жыцьці камуны: колькі жанчын у камуне, умовы іх жыцьця і працы, удзел камунарак у сацыялістычным спаборніцтве. Найлепш вы вазьміце адзін момант з жыцьця камуны і падрабязна апішыце яго, прывёўшы прыклады.

Дэраш. З вашага допісу ня відаць, на якую-ж суму падпісаліся дэлегаткі на пазыку індустрыялізацыі. Напішыце, як пастаўлена у вас справа з падрыхтоўкай працоўных жанчын да абароны краіны.

Коцік. Вы пішаце: „Надзвычайна вялікую дапамогу даюць ясьлі“, але з допісу ня відаць зусім як-жа пастаўлена праца ў дзіцячых ясьлях. Пішыце нам аб тым, якую практычную работу правялі дэлегацкія сходы мінулага складу і як ідзе падрыхтоўка да перавыбараў дэлегатак.

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары* { С. Крэмер. М. Меерзон.

Менск, друкарня БДВ. Заказ № 3581. У ліку 9.000 экз. Галоўлітбел № 2630.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

Трахома—страшная болезнь.

Сущность трахомы заключается в следующем: пораженного трахомой больного на слизистой оболочке, выстилающей веки с внутренней (скользящей по глазному яблоку) поверхности, появляются желтовато-сероватого цвета, похожие на лягушечью икру, зернышки, которые обладают способностью прорастать вглубь лежащаго под слизистой оболочкой плотный хрящевой остов века.

В дальнейшем трахоматозные зернышки оставляют после себя неровные беловатые рубчики. Эти рубчики резко изменяют вид и строение слизистой оболочки и хряща, которые становятся неровными, сморщенными, стянутыми, а все веко теряет свое нормальное положение в отношении глазного яблока.

Веки корытообразно изгибаются, отчего их края с ресницами заворачиваются к глазному яблоку и при миганьи начинают тереть по роговице (прозрачная часть глазного яблока), которая, раздражаясь от этого, воспаляется и мутнеет. На роговице появляются нарывчики и язвы, которые после заживания оставляют непрозрачные рубцы или бельма, приводящие человека к ослаблению зрения и, наконец, слепоте.

Начинается трахома очень незаметно и постепенно. Сначала у заразившегося появляется ощущение, будто он чем то запорошил глаза. Они краснеют, слезятся, по утрам иногда гноятся. Но обычно значительной боли нет, зрение еще совсем не страдает, и занятый работой человек считает свою болезнь пустяком, из-за которой не стоит бросать работу и тратить время на обращение к врачу. Больной все ждет, что не сегодня-завтра болезнь пройдет сама собой. Но день за днем проходит, а глаза не только не улучшаются, а даже больше гноятся. Веки внутри начинают припухать, краснота увеличивается, усиливается и зуд в газах. Больной трет их руками, часто грязными и этим еще больше усиливает воспаление и отделение гноя. Гной по утрам склеивает ресницы, так что трудно открыть глаза, не промыв их.

Дальше пройдет 3-4 месяца, болезнь развивается, в глазах продолжается жжение и больной начинает хуже видеть. На роговице появляются глубокие язвы, которые даже при хорошем лечении в дальнейшем всегда заживают рубцом.

Вылечить эти бельма—нельзя потому, что больной поздно обратился к врачу. Если бельмо большое и закрыло всю роговицу—больной неизлечимо ослеп.

Лечение трахомы нужно начать возможно раньше и только у врача. Лечение у бабок не приносит никакой пользы, а наоборот—вредно. Прикладывание навоза, промывание мочой—все это, конечно, только ухудшает болезнь.

Трахома—болезнь длительная. Чем раньше больной начал лечиться, тем скорее он от нее избавится. Если трахому своевременно и аккуратно лечить, то она проходит в 2-3 месяца.

Трахома чрезвычайно заразительна. Передается эта болезнь слизистыми гройными выделениями из глаз, которые обычно бывают у страдающих трахомой больных. При нашей малокультурности, часто через несколько месяцев после заболевания одного, почти вся семья, где имеется больной,—заболевает. Особенно, если заболевший не лечится. Но этим дело не кончается. Соседка, зашедшая в зараженную семью и вытираясь общим полотенцем, на котором мог остаться гной из трахомных глаз, переносит заразу в свою семью. Дети, играя вместе, заражают друг друга, если среди них есть ребенок больной трахомой.

Можно заразиться также и через рукопожатие. Потрет больной человек свои глаза рукою и, если на пальцах останется немного гною, то он передает заразу вместе с рукопожатием здоровому человеку. Заражаются и через спанье на общей подушке. Переносится трахома и мухами. Муха, перелетая с руки трахомного больного, на которую попала зараза из глаза, переносит эту заразу другому человеку. Заражаются и в бане, при мытье из общей банной посуды, т. к. зараза может легко попасть в глаз с водой.

Чтобы предупредить трахому, надо принять все меры к тому, чтобы трахомный гной не мог попасть в здоровый глаз. Трахомный больной должен спать на отдельной кровати, иметь отдельное одеяло, подушку и полотенце. Не нужно с ним здороваться за руку и целоваться. Больной должен часто мыть руки. Надо уничтожать мух.

ПАРАДЫ ГАСПАДЫНЯМ.

Суп из свежих грибов

600—800 грамм свежих грибов очистить, нарезать, обмыть, поставить вариться в 3 бутылках воды, немного посолодить, положить 50 грамм сливочного масла. Когда грибы сварятся, прибавить мелко нарезанного зеленого лука, укропа или зелени петрушки, немного нарезанного картофеля, 1—2 лавровых листа, несколько зерен английского перца, доварить вместе с грибами, приправить 1 стол. ложкой муки с 1 ст. ложкой масла, которое надо сначала разбивать понемногу горячим бульоном. Можно прибавить 1 стакан сметаны. Это обойдется немного дороже, но зато будет вкуснее.

Вредные кондитерские товары

Очень часто при подделках пищевых продуктов „собственного производства“ для придания им красивого вида не стесняясь пользуются вредными для здоровья красками. Очень распространена, например, подкраска пирожных, конфет, напитков. Кондитерские товары особенно часто подделываются и вместо натуральных фруктовых и ягодных соков употребляют эфир и эссенции с примесью различных вредных веществ, а для окраски берутся вредные краски. Вот почему не надо покупать пирожные и ярко окрашенные конфеты у частников на базарах и лотках.

В настоящее время особенно много появилось на рынке поддельного шоколада и какао „собственного производства“ продавцов-спекулянтов, сбывающих часто эти продукты из-под полы.

Натуральное какао должно быть ароматичным, коричневого цвета и горько вяжущего вкуса. При варке настоящего какао на дне стакана не остается осадка, что обязательно при поддельном какао.